**Ідзе экзаменацыйная сесія.** *Жадаем вам поспехаў, дарагія сябры!* Ні пуха, ні пяра!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 23 (368) | Серада, 10 чэрвеня 1959 года | Цана 20 кап.

## НАС 710 ЧАЛАВЕК

ЦУДОЎНЫ І ПРЫГОЖЫ наш родны Мінск, асабліва вечарам, калі яго вуліцы заліты электрычным святлом, калі раз-по-раз успыхваюць і гаснуць рознакаляровыя агні рэклам і срабрыста зіхацяць лісце маладых дрэў, што сваім бурным ростам, зялёным квеценнем радуе сэрца мінчан. І як не да твару нашаму гораду, мінчанам, што яшчэ час-ад-часу ўсплывае брудны накіп хуліганства. Хіба не сорамна нам, што яшчэ калі-нікалі на праспекце імя Сталіна можна убачыць п'яных, якія лаюцца, прыстаюць да прахожых, калі асобныя грамадзяне не задумаўшыся могуць кінуць на тратуар акурак, абгортку ад марожанага, тралейбусны білет, могуць вытрасці з кішэні шматкі папер. Праўда, такія выпадкі здараюцца ўсё радзей і радзей. І ў гэтым вялікая заслуга простых, сціплых людзей з чырвонымі павязнамі на рукавах, людзей, якіх наш народ любоўна называе старажытным і гордым рускім словам «дружыннікі».

У нашай універсітэцкай дружыне 710 чалавек. Гэта—лепшыя з лепшых, тыя, імёны якіх назвала грамадкасць універсітэта. Самая шматлікая дружына створана на біялагічным факультэце, дзе амаль кожны другі студэнт і супрацоўнік сталі ў яе шэрагі. Кожную сераду, суботу і нядзелю можна бачыць універсітэцкіх дружыннікаў на праспекте імя Сталіна, Цэнтральнай плошчы, вуліцах Кірава і Карла Маркса. Тут яны нясуць сваё дзяжурства, пільна сочаць за парадкам.

Два месяцы—тэрмін невялікі. І ўсё ж можна сказаць, што дружына універсітэта працуе добра. Ужо шырока вядомы як арганізатары, што ўсёй душой хварэюць за справу, камандзіры атрадаў Ляўко, Драгун, Даўгарукаў. Выдатна зарэкамендавалі сябе дружыннікі-камсамольцы Іра Фрыд, Эла Шушкіна, Аркадзь Круцько, Яўген Жыркевіч і дзесяткі і сотні іншых юнакоў і дзяўчат. Можна быць упэўненым, што у летапіс гісторыі дружын Мінска яны ўпішуць слаўныя старонкі.

Кажуць, што ў кожнай атары ёсць благая авечка. Нажаль, знайшліся яны і сярод нас. З халадком аднесіцца да сваіх абавязкаў камандзір атрада М. Сыраквaш. Ці не таму яго падначаленыя студэнты філфака Жук, Сянькевіч, Шчасны дзяжураць апусціўшы рукавы, абы як. А старшыня прафкома М. Васін наогул з'яўляецца «пачэсным» членам народнай дружыны, які яшчэ ні разу не пабываў на дзяжурстве. Не, не патрэбны нам такія дружыннікі! І няхай яны пакідаюць нашы рады, не засцяць дарогі! Дружына ж толькі ад гэтага выйграе, зробіцца яшчэ больш моцнай, больш баяздольнай. На іх месца ж стануць сотні новых, сумленных юнакоў і дзяўчат.

Ты—дружыннік! Народ, партыя, камсамол даверылі табе ахову грамадскага парадку, ахову спакою савецкіх грамадзян. Будзь жа варты гэтага давер'я, пільна стой на варце інтарэсаў народа, дружыннік універсітэта!

ФОТАРЭПАРТАЖ

## РОЗНЫЯ, АЛЕ ДОБРЫЯ...

*ЦІХА! ІДУЦЬ ЭКЗАМЕНЫ!» Такі надпіс можна было прачытаць на дзвярах аўдыторыі № 37 біялагічнага корпуса, дзе ў заолагаў ішлі дзяржаўныя экзамены па гісторыі КПСС. Дзяўчаты і хлопцы, такія розныя ў звычайныя дні па характару, знешнасці, тэмпераменту, зараз адчуваюць адно агульнае хваляванне перад тым, як узяць у рукі экзаменацыйны білет.*

*— Што мне трапіць?—Гэтае пытанне хвалюе кожнага са студэнтаў. Але... усе білеты добрыя, выбірай па густу. Тыя, да каго яшчэ не дайшла чарга, размясціліся з кніжкамі і канспектамі ў руках у калідоры, на падаконніках і нават на лесвічнай пляцоўцы. Аказваецца, і з дапамогай гэтай звычайнай лесвіцы можна штурмаваць бастыёны крэпасці навукі!*



Тыя, да каго яшчэ не дайшла чарга...

*Ну, а тыя, што стаяць ля дзвярэй, каму хутка пераступіць іх парог, напэўна адчуваюць сябе як Цэзар, перад тым як перайсці Рубікон. Затое, калі білет ў цябе ў руках, можна сесці і перастаць хвалявацца, трэба ўспомніць усё тое, што датычыцца да пытання білета. Але адразу зрабіць гэта цяжка. Адна студэнтка механічна папраўляе прычоску, другая машынальна водзіць пальцам па ілбе. Але вось ужо аловак пабег па паперы, як сведка таго, што пытанні будуць асветлены добра.*

*Да стала падыходзіць Іраіда Качура. Хвалюючыся, дзяўчына праглядае пытанні білета. Таксама з хваляваннем, а затым ўсе больш спакойна пачынае адказваць.*

*Адказ Іраіды лагічны, канкрэтны, не патрабуе наводзячых пытанняў. У кожнага з членаў Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі асобны лісток, дзе яны папярэдне прастаўляюць адзнакі. І кожны, ацэньвае адказ Іраіды вышэйшым балам.*

*Такімі ж пераканаўчымі адказамі парадавалі і многія іншыя студэнты.*

*(Працяг на стар. 2)*



Рыхтуюцца да адказу.



Адказ Іраіды канкрэтны, лагічны...

## ЗАДАЧЫ НА БУДУЧАЕ

Навучальны год падыходзіць да канца. Пачалася экзаменацыйная сесія. Ад таго, як быў пастаўлены вучэбны працэс, як студэнты працавалі на працягу года, як наведвалі лекцыі, залежыць зараз вельмі многае. Што трэба зрабіць, каб сесія праходзіла арганізавана, каб студэнты мелі магчымасць добра рыхтавацца, каб нішто не перашкаджала плённай рабоце—вось пытанні, якія абмяркоўвалі камуністы філалагічнага факультэта на сваім партыйным сходзе.

Вучэбны план выкананы. У параўнанні з мінулым годам знізіўся працэнт пропускаў студэнтамі заняткаў. Увага дэканата і партыйнай арганізацыі факультэта была звернута на тое, каб павысіць якасць чытаемых лекцый, палепшыць падрыхтоўку спецыялістаў—педагогаў і журналістаў. З гэтай мэтай на шасці кафедрах факультэта практыкавалася ўзаемнае наведванне выкладчыкамі лекцый з наступным іх абмеркаваннем.

Але разам з тым камуністы адзначалі, што яшчэ мала студэнтаў займалася навуковай работай у гуртках, здавальняюча працавалі асобныя кабінеты, студэнты-дыпламанты затрымлівалі здачу сваіх работ.

— Нам патрэбна,—гаворыць загадчык кафедры беларускай мовы М. І. Жыркевіч,—наблізіць сваю работу да жыцця, да тых задач, якія перад намі пастаўлены. Не трэба забываць, што мы рыхтуем педагогаў. Студэнтам факультэта час зацікавіцца школамі-інтэрнатамі горада і, магчыма, узяць шэфства над імі.

Камуністы факультэта гаварылі таксама аб тым, як лепш падрыхтавацца да новага навучальнага года, як больш арганізавана правесці набор на першы курс у адпаведнасці з новымі патрабаваннямі, якія вынікаюць з Закона аб перабудове вышэйшай школы.

Я. ПРАКОП'ЕЎ.

## ТОЛЬКІ ДОБРА І ВЫДАТНА

Любяць студэнты слухаць лекцыі па замежнай літаратуры Навума Ісакавіча Лапідуса. Могуць яны і добра адказваць на экзаменах. 31 мая студэнты II курса аддзялення журналістыкі на экзаменах па гэтай дысцыпліне атрымалі 22 добрыя і выдатныя адзнакі.

— Асабліва падабаліся мне адказы,—адзначыў Н. І. Лапідус,—студэнтаў М. Шобы, І. Каспяровіча, С. Палякова, Я. Пракоп'ева. Яны трывала ведалі матэрыял і ўсе атрымалі «выдатна».

В. КАВАЛЬКОЎ.

# РОЗНЫЯ, АЛЕ ДОБРЫЯ...

(Заканчэнне. Пачатак глядзіце на 1 стар).



Дазвольце! Не зразумела.

*Камсорг Мая Сяляева, якая зарэкамендавала сябе*

## ФОТАРЭПАРТАЖ

*на працягу пяці год, як чулы і спагадлівы таварыш, не падвяла і на гэты раз. Яе адказ ацэнены таксама на «выдатна».*

*Вядомы на факультэце як майстар слова Міхалковіч, усімі паважаны Гесь, Таня Сакалова, энтузіястка СНТ, сваімі адказамі прынеслі вялікае задавальненне членам экзаменацыйнай камісіі.*

*Па-рознаму адказвалі студэнты. Адны, хвалюючыся, непакойна круцячы аловак, другія спакойна, упэўнена, амаль не заглядваючы ў свае запісы. Трэція, наадварот, амаль не адрываліся ад іх. Але ўсе студэнты выявілі глыбокія веды па гісторыі КПСС.*

*Членам экзаменацыйнай камісіі ўсё-ж такі хапае работы. Аб'ектыўная адзнака ведаў патрабуе неаслабнай ўвагі на працягу ўсяго адказу студэнта. Адна невялікая недакладнасць у адказе —адразу ж чуецца заўвага экзаменатара дацэнта М. Е. Гракава:*

*— Дазвольце! Не зразумела. Трэба ўдакладніць...*

*І студэнты дапаўняюць свае адказы.*

*Калі адказалі ўсе, адбылася нарада экзаменацыйнай камісіі. Паглядзіце, як ажыўлена яе члены ўзвешваюць усе «за» і «супроць» па кожнай прапануемай адзнацы.*

*Хочацца ў заключэнне выказаць агульную думку Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі пад старшынствам акадэміка М. В. Турбіна, члены якой прыйшлі да вываду, што заолагі—моцная, добра падрыхтаваная група. Малайцы заолагі!*

*В. КАСЦЮГОВА.*



Члены экзаменацыйнай камісіі ўзважваюць усе «за» і «супроць».

# КАНСПЕКТЫ БЫЛІ Ў ТРАІХ

Вынікі першага экзамену для нас былі нібы пярун з яснага неба. А як жа! Адзінаццаць нездавальняючых адзнак атрымалі на экзамене па палітэканоміі географы трэцяга курса.

Гэта было нечаканасцю. Але падумаўшы, прааналізаваўшы тое, што здарылася, камсамольскія актывісты курса прыйшлі да вываду, што гэты вынік зусім заканамерны.

Прычыны тояцца ў многім. Курс палітэканоміі чытаўся адначасова нам і студэнтам хімфака. На лекцыях прысутнічала, ці больш правільна, павінна было прысутнічаць па 100 чалавек. І вось некаторыя з маіх аднакурснікаў, здавалася б, дарослыя людзі, карыстаючыся тым, што улік наведвання лекцый быў крыху абцяжараны, зусім па-дзіцячаму злоўжывалі гэтым, прапускалі іх. Ды і тыя, што прысутнічалі на занятках, не заўсёды слухалі лектара, шумелі, займаліся пабочнымі справамі. Часам здаралася так, што выкладчыку патрабавалася мінут пяць, каб супакоіць занадта вясёлых дваццацігадовых хлопчыкаў і дзяўчынак.

Трэба прызнаць, што камсамольскае бюро курса, у якое акрамя мяне ўваходзіў Уладзімір Маліноўскі і Дзмітры Цяцера, не аказалася на патрэбнай вышыні. Зразумела, пытанні вучобы мы ставілі на камсамольскіх сходах. Але больш гаварылі агульнымі словамі, амаль не разбіралі канкрэтных парушальнікаў дысцыпліны. І вось у выніку, калі надышоў экзамен, канспекты па палітэканоміі аказаліся толькі ў трох чалавек. Іра Іванова, Рэгіна Матусевіч, Ларыса Дробуш, Віктар Бачыла і іншыя атрымалі двойкі. На наша здзіўленне, сярод праваліўшых экзамен былі і здольныя студэнты, якія не сур'ёзна падышлі да падрыхтоўкі. Тут у першую чаргу трэба назваць Уладзіміра Маліноўскага, які ў мінулую сесію заваяваў права на павышаную стыпендыю, а таксама Анатоля Жадана.

Гэты вынік быў для нас добрым урокам. Да наступных экзаменаў мы рыхтаваліся больш старанна і правалаў у нас не было.

Камсамольскае бюро курса улічыць урокі гэтай сесіі. У далейшым мы будзем імкнуцца ставіць пытанні вучобы больш канкрэтна, абмяркоўваць, як кожны студэнт працуе над кнігай, як ён канспектуе лекцыі, якая патрэбна яму дапамога. З другога боку, было б пажадана, каб тэарэтычны курс і практычныя заняткі вёў адзін і той жа выкладчык.

**БІРЫЛА, сакратар камсамольскай арганізацыі III курса геафака.**

# Здалі залік

Паспяхова здалі залік па сучаснай рускай мове студэнты II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Асабліва падабаліся выкладчыку Т. Плешчанцы адказы студэнтаў А. Міклуша, М. Аляшкевіч, А. Матрунёнка, В. Манько, Г. Пракаповіч і В. Манасзон.

**М. ЖУК.**

# НЕ АДСТАВАЦЬ АД ЖЫЦЦЯ

Насценгазета—люстра жыцця факультэта. У ёй нам бачны нашы поспехі і недахопы. Першыя нас радуюць, апошнія засмучаюць. Чэрвенскі нумар «Студэнта гістфака» асаблівую ўвагу звяртае на вынікі экзаменаў (артыкул І. Базылёва «Зрабіць вывады»). Газета не толькі канстатуе факты, але і ставіць надзённыя задачы, дае перспектыву іх рашэння.

А як жа выглядаюць у гэты час насценгазеты другіх факультэтаў?

У «Савецкім юрысце» настрой яшчэ перадпершамайскі; лісткі заметак пажоўклі, фатаздымкі апалі...

Насценгазеты «За мічурынскую біялогію» і «Савецкі хімік» з відных месц перанесены ў цёмныя куткі, таму што ад іх засталіся толькі пустыя стэнды. Насценгазету матфака «Рашым любую задачу» наогул не ўбачыш у калідоры, і ўзнікае сумненне ў яе існаванні. Няўжо рэдкалегіям гэтых газет не хапае сіл выпусціць свежыя нумары? Калі так, то хаця б баявыя лісткі. Нельга паверыць у тое, што некаторыя з адказных рэдактараў рашылі, што пятага мая пасля агляду насценгазет універсітэта, атрыманнем грамат і прэмій закончылася і іх праца. Іменна ж у час сесій яны асабліва неабходны. Забывацца на гэта нельга.

**К. ПЯТРОЎ.**

# Грунтоўнае даследаванне

Нядаўна вышла ў свет кніга В. І. Сцяпанава «Философские и социологические воззрения В. Г. Белинского», якая з'яўляецца вынікам шматгадовай працы аўтара. Сярод шматлікіх работ аб Бялінскім да цяперашняга часу не было кнігі, якая-б у дастатковай ступені асвятляла філасофскія і сацыялагічныя погляды В. Г. Бялінскага. Былі выдадзены такія даследаванні толькі аб Герцану, Дабралюбаву, Чарнышэўскім.

Спроба аўтара задаволіць наспеўшую патрэбу і запоўніць гэты прабел, даўшы ўсебаковы аналіз філасофіі Бялінскага, прааналізаваць уздзеянне ідэй і канцэпцый Бялінскага на далейшае развіццё передавой айчыннай філасофіі і паказаць, чым блізкі Бялінскі нашаму савецкаму народу і ўсяму перадавому чалавецтву—гэта спроба, на нашу думку, увянчалася поспехам.

Кніга складаецца з уводзін і пяці раздзелаў. Ва ўводзінах аўтар коратка спыняецца на асобе В. Г. Бялінскага як аднаго з самых выдатных прадстаўнікоў перадавой культуры і вызваленчага руху ў Расіі ў першай палове XIX стагоддзя, характарызуе яго прагрэсіўную дзейнасць, багатую ідэйную спадчыну, якая і да нашых дзён прыцягвае да сябе ўвагу вучоных і літаратараў.

В. І. Сцяпанаў паказвае вялікае значэнне ленінскіх ідэй для сапраўды навуковага падыходу і ацэнкі гісторыі рускай філасофіі і яе буйнейшых прадстаўнікоў.

Аўтар дае рашучы адпор буржуазным фальсіфікатарам і паклёпнікам, якія спрабуюць прынізіць і ачарніць Бялінскага і іншых перадавых рускіх мысліцеляў мінулага.

Сэнс сучаснай пісаніны белаэмігрантаў М. Лоскага, В. Зяньkоўскага, А. Філіпава і іншых «гісторыкаў» рускай філасофіі з асяроддзя ідэолагаў імперыялістычнай рэакцыі (Г. Ветэра, Р. Хеэра і да іх падобных) выяўляецца ў спробе паказаць дыялектыка-матэрыялістычную філасофію як чужую духу рускага народа, у намаганнях паказаць ленінізм у якасці вучэння, якое не мае ідэйнай глебы у Расіі, спадчыннай сувязі з папярэднім развіццём філасофскай і грамадска-палітычнай думкі, у спробе прынізіць значэнне рускай культуры і сказіць гісторыю ідэйнага развіцця рускага народа і ў выніку ўнушыць замежнаму чытачу недавер'е і скептыцызм да справы будаўніцтва новага жыцця ў СССР.

Раскрыццё В. І. Сцяпанавым сучасных ілжывых рэакцыйных канцэпцый гісторыі рускай грамадска-палітычнай думкі шляхам усебаковага навуковага асвятлення з пазіцыі марксізма-ленінізма філасофскіх і сацыялагічных поглядаў Бялінскага, як выдатнага прадстаўніка рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі XIX стагоддзя, мае актуальнае значэнне, бо яно ў значнай ступені пралівае свет на пытанне аб гістарычнай падрыхтоўцы савецкага народа да ажыццяўлення ім ролі авангарда працоўнага чалавецтва, стваральніка новага, камуністычнага ладу, дапамагае зразумець ролю ленінізма, як вышэйшага дасягнення рускай і сусветнай культуры.

У першым раздзеле В. І. Сцяпанаў паказвае фармаванне і развіццё філасофскіх поглядаў Бялінскага ў 30-я гады XIX стагоддзя. Аўтар падкрэслівае, што толькі марксісцкая навука найбольш усебакова раскрыла і абгрунтавала сувязь дзейнасці і светапогляду Бялінскага з гістарычнымі патрэбамі свайго часу.

На багатым фактычным матэрыяле В. І. Сцяпанаў шырока раскрывае думку У. І. Леніна, выказаную ў артыкуле «Аб вехах». У. І. Ленін, выкрываючы рэнегатаў-лібералаў, якія спрабавалі даказаць, што рэвалюцыйныя погляды Бялінскага і Чарнышэўскага прынесены з-за мяжы, прама заяўляе, што ў сваім славутым пісьме да Гогаля Бялінскі выказвае настрой рускіх прыгонных сялян, абурэнне народных мас прыгонным гнётам. Гэтае ленінскае ўказанне з'яўляецца важным для навуковага разумення рэвалюцыйна-дэмакратычнай ідэалогіі ў Расіі XIX стагоддзя наогул і ў прыватнасці ідэалогіі Бялінскага.

Аўтар падкрэслівае і другую не менш важную думку У. І. Леніна, выказаную ў кнізе «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме». У. І. Ленін гаворыць, што саракавыя гады XIX стагоддзя з'яўляюцца пачаткам пошукаў перадавой рэвалюцыйнай тэорыі ў Расіі, пошукаў, якія працягваліся да 90-х гадоў і закончыліся марксізмам. Бясспрэчна, што адным з першых і самых «самаахвярных шукальнікаў» перадавой тэорыі быў Бялінскі, які пісаў, што «разбурэнне старога заўсёды адбываецца праз з'яўленне новых ідэй».

На вялікім канкрэтна-гістарычным матэрыяле аўтар прасочвае гэтыя пошукі, барацьбу за ісціну, памылкі, часовы адыход ад ісціны і настойлівае імкненне набыць яе ізноў. Ідэйная эвалюцыя Бялінскага, поўная пакутлівых тэарэтычных пошукаў, пераход ад асветніцтва і ідэалізма да рэвалюцыйнага дэмакратызма і матэрыялізма знаходзіць у кнізе ўсебаковае асвятленне.

У раздзеле аб дыялектыцы В. І. Сцяпанаў паказвае, што пераход на пазіцыі рэвалюцыйнага дэмакратызма прывёў Бялінскага да новага разумення дыялектыкі, якая становіцца ў яго больш сталай і якая на першы план вылучае ідэю рэвалюцыйнай барацьбы і дыялектычнага адмаўлення.

Аўтар зусім слушна адзначае, што, даводзячы самастойнасць філасофскай думкі Бялінскага і выяўляючы карэнныя адрозненні рэвалюцыйных поглядаў і матэрыялістычных вучэнняў рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі ад кансерватыўных сацыяльна-палітычных поглядаў і ідэалістычных вучэнняў нямецкай філасофіі, разам з тым нельга адмаўляць той гістарычны факт, што прагрэсіўныя ідэі класічнай нямецкай філасофіі і, перш за ўсё, дыялектыка Гегеля, знаходзілі водгук у Бялінскага і адыгралі немалую ролю ў выпрацоўцы яго метаду. Высока ацэньваючы дыялектычны метад Гегеля, Бялінскі яшчэ ў 1843 годзе ў рэцэнзіі на кнігу М. Маркевіча «Гісторыя Маларасіі» пісаў, што гэты «строгі і глыбокі метад адкрыў вялікую дарогу свядомасці чалавечага розуму і назаўсёды пазбавіў яе ад звілістых абходных шляхоў, па якіх яна дагэтуль так часта збівалася на шляху да сваёй мэты. Гегель зрабіў з філасофіі навуку, і велізарная заслуга гэтага найвялікшага мысліцеля новага свету заключаецца ў яго метадзе..., да таго верным і моцным, што толькі на яго аснове і можна абвергнуць тыя з вынікаў яго філасофіі, якія цяпер недастатковыя ці няверныя: Гегель толькі тады памыляўся ў дадатках, калі адыходзіў ад уласнага метаду» (Выбранныя філасофскія творы», т. І, стар. 500—501).

(Заканчэнне на стар. 3).

# ДА СЕСІІ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ

Экзаменацыйныя сесіі з'яўляюцца састаўной часткай і заключным звяном вучэбнага працэсу. На экзаменах замацоўваюцца і правяраюцца як веданне студэнтамі праграмнага матэрыялу, так і навыкі іх самастойнай работы з вучэбнай і навуковай літаратурай. Партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі і ўвесь калектыў гістарычнага факультэта вялі на працягу другога семестра бягучага года паўсядзённую настойлівую барацьбу за паляпшэне вучэбнай, навукова-даследчай і выхаваўчай работы.

Кафедры факультэта сталі ўдзяляць больш увагі вучэбнай і навукова-даследчай рабоце студэнтаў.

Кафедра новай гісторыі (загадчык кафедры дацэнт т. Шнеерсон) і другія правялі адкрытыя пасяджэнні, на якіх абмеркавалі пытанні аб самастойнай рабоце студэнтаў, ходзе практычных заняткаў і падрыхтоўцы да экзаменацыйнай сесіі. Пытанне аб падрыхтоўцы да экзаменацыйнай сесіі і самастойнай рабоце абмяркавана таксама на вучоным Савеце факультэта, акадэмічных курсах і ў студэнцкіх групах.

Значную дапамогу студэнтам у іх самастоўнай рабоце аказваюць кабінеты. На працягу II семестра ў кабінеце гісторыі СССР сістэматычна адзін раз у нядзелю дэманстраваліся навуковыя і дакументальныя кінафільмы па гісторыі СССР, праведзены тэматычныя лекцыі і экскурсіі ў мастацкі музей. Кабінет гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў папоўніўся наглядньмі дапаможнікамі па культуры старажытнага Усходу і антычнага свету, якія шырока выкарыстоўваліся на лекцыях і практычных занятках. Сіламі студэнтаў I курса (Ярмілаў, Кірычэнка, Ялсукоў) зроблены наглядныя дапаможнікі (карты) па гісторыі старажытнага Рыма. Па-ранейшаму нездавальняюча працуе, што выклікае законную крытыку з боку студэнтаў, кабінет новай гісторыі (загадчык кабінетам Л. П. Дорская).

У выніку праведзенай работы значна палепшылася самастойная работа студэнтаў. Семінарскія і практычныя заняткі па гісторыі КПСС (выкладчык т. Сіліванчык), гісторыі старажытнай Грэцыі і Рыма (дацэнт т. Нечай) на I курсе, гісторыі КПСС (дацэнт т. Мацко), гісторыі СССР (дацэнт т. Ігнаценка) на II курсе, па палітычнай эканоміі (дацэнт т. Аляксееў), гісторыі СССР (дацэнт т. Караткевіч) на III курсе, гістарычнаму матэрыялізму (дацэнт т. Панкратаў), гісторыі навейшага часу (кандыдат гістарычных навук т. Мельцэр) на IV курсе праходзілі пры вялікай актыўнасці студэнтаў. Большасць студэнтаў на семінарскіх і практычных занятках глыбока раскрывалі вучэбны матэрыял. Студэнты Базылёў, Ярмілаў (I курс), Паведайла, Арцеменка, Амельяновіч (II курс), Багданаў, Васілеўскі, Міхайлаў (III курс), Габрынец, Загорскі, Драгун (IV курс) і другія сістэматычна рыхталіся да семінарскіх і практычных заняткаў, выкарыстоўвалі дадатковую літаратуру і крыніцы. Аднак асобныя студэнты—Магіло (I курс), Андрэйчык, Вінаградаў (II курс), Нічыпаровіч, Стаян (III курс), Гербст, Манько (IV курс) працавалі не ў поўную меру сваіх сіл і здольнасцяў, часта прапускалі заняткі.

Камсамольскае бюро факультэта сістэматычна праводзіла масавыя мерапрыемствы, якія садзейнічалі вучобе і выхаванню студэнтаў. Так, праведзены сустрэчы са старэйшымі бальшэвікамі, удзельнікамі рэвалюцыйнага падполля, членамі КПЗБ; удзельнікамі брыгад камуністычнай працы заводаў «Бальшэвік» і аўтаматычных ліній. Студэнтам чыталіся лекцыі па міжнароднаму становішчу і практыцы камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

Студэнты V курса паспяхова закончылі напісанне і абарону дыпломных работ і здаюць дзяржаўныя экзамены.

У выніку работы ў архівах, музеях, бібліятэках Ленінграда, Мінска, Вільнюса, Брэста, Гродна, Рыгі, Віцебска студэнты V курса сабралі вялікі гістарычны матэрыял, на аснове якога напісалі змястоўныя дыпломныя работы. Асноўная маса студэнтаў-выпускнікоў паказала дастатковае уменне з марксісцка-ленінскіх пазіцый самастойна асвятляць складаныя пытанні гістарычнай навукі. Кафедры адзначылі ў якасці лепшых дыпломныя работы студэнтаў Малашэвіча, Садоўскага, Якімава, Прахаровіча і іншых. Для студэнтаў V курса кафедра гісторыі КПСС арганізавала чытанне аглядных лекцый па найбольш складаных пытаннях гісторыі партыі і творах У. І. Леніна.

Няма сумнення ў тым, што прафесарска-выкладчыцкі састаў і калектыў студэнтаў гістарычнага факультэта правядуць наступную сесію на высокім арганізацыйным узроўні.

**П. САВАЧКІН,**
дэкан гістарычнага факультэта.



Даўно вядома, што рыхтавацца да экзаменаў на свежым паветры рэч добрая і карысная. На здымку: студэнты філфака ва універсітэцкім скверыку.

# Лыжка дзёгцю

У большасці студэнтаў экзамены—гэта крок уперад, на вышэйшую ступень навукі і жыцця.

Беручы экзаменацыйны білет, можа зусім не так адчувала сябе Ала Спіткоўская, як адчувае спартсмен перад фінішам, але прыкметна хвалявалася: яна ж стаіць перад Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй... Выпускніца разважліва грунтоўна адказвае на пытанне «XXI з'езд КПСС—з'езд будаўнікоў камунізма». Пасля адказу ёй задаюць яшчэ некалькі пытаняў па гісторыі КПСС. Ала і іх асвятляе выдатна.

Старшыня дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі акадэмік В. М. Перцаў і асістэнты задаволена усміхаюцца: нічога не скажаш, глыбокія і трывалыя веды ў студэнткі, такую не «зрэжаш», каб і хацеў!

З вялікімі поспехамі завяршае сваю пяцігодку А. Спіткоўская. Яна абараніла дыпломную работу і здала гэты экзамен на «выдатна».

Але ці ўсім выпускнікам гістфака можна пець падобныя дыфірамбы? Не, да V курса «дацягнуліся» В. Міхалап і М. Самусёў. Яны спадзяваліся, што дзяржаўныя экзамены—гэта дробязь, выпусцяць неяк, выдадуць дыплом і тады яны—гайда на месца работы. Пралічыліся на гэты раз хлопцы. Доўга «плавалі» на экзамене. І як не кідала ім камісія выратавальныя кругі—наводзячыя пытані—сябры пайшлі на дно. Яны атрымалі «нездавальняюча» і развітваюцца на час з марай аб дыпломе.

Калі побач з сумленнымі, добра падрыхтаванымі выпускнікамі У. Кананам, С. Сцепанюком, Л. Засмужац і многімі іншымі называюць імя іх аднакурсніка, які праваліў дзяржаўны экзамен, робіцца неяк крыўдна і няёмка. Гэта нібы лыжка дзёгцю ў бочку мёду.

**П. КРЫВАНОЖАНКА.**



У час турысцкага паходу. Фотаэцюд А. Лукашова.

# Грунтоўнае даследаванне

(Заканчэнне. Пачатак глядзіце на 2 стар.).

Аўтар вельмі ўдала паказвае, што Бялінскі не здаволіўся дыялектыкай Гегеля, а пайшоў далей, ён вызваліў яе ад містыцызма і ідэалістычнага шалупіння, і яго дыялектыка, напаўняючыся матэрыялістычным зместам, становіцца вызваленчай і пераўтваральнай сілай. Растлумачваючы мінулае, разумеючы сучаснае і заглядаючы ў будучае, дыялектыка, на думку Бялінскага, павінна дапамагчы чалавечай асобе вызваліцца ад ганебных ланцугоў неразумнай рэчаіснасці.

У раздзеле даволі падрабязна разглядаецца трактоўка Бялінскім асобных пытанняў дыялектыкі, якая паказвае нам шырыню і глыбіню ахопу мысліцелем прадметаў і з'яў аб'ектыўнай рэчаіснасці.

Разам з тым В. І. Сцяпанаў робіць зусім правільны вывад аб тым, што як ні блізка Бялінскі падыходзіў да разумення асноўных законаў матэрыялістычнай дыялектыкі і асобных яе катэгорый, але ён яшчэ не звёў усяго гэтага ў адзіную сістэму, і яго дыялектыка, як і дыялектыка другіх рэвалюцыйных дэмакратаў, з'яўляецца пераходным звяном ад дыялектыкі ідэалістычнай да дыялектыкі матэрыялістычнай.

Трэці раздзел прысвечаны матэрыялізму Бялінскага. Глыбока аналізуючы крок за крокам эвалюцыю Бялінскага ад ідэалізма да матэрыялізма, аўтар падкрэслівае, што станаўленне свядома-матэрыялістычных поглядаў на прыроду, на яе развіццё, ішло разам з развіццём яго рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў на грамадства. Аўтар усебакова асвятляе дзейнасць Бялінскага пераходнага перыяду і робіць правільны вывад аб тым, што рэвалюцыйна-дэмакратычныя перакананні не маглі доўга ўжывацца з філасофіяй ідэалізма і таму апошнія паступова былі пераадолены. К 1844 году Бялінскі ўжо сфарміраваўся як баявы матэрыяліст, які да канца свайго жыцця вёў рашучую барацьбу супроць ідэалізма і рэлігіі. Матэрыялістычная пазіцыя дапамагла Бялінскаму правільна зразумець рэчаіснасць і працэс яе пазнання. На прыкладах рашэння праблемы ісціны і праблемы ўзаемаадносін тэорыі і практыкі аўтарам паказаны моцныя і слабыя бакі поглядаў вялікага рэвалюцыйнага дэмакрата.

Прызнаючы глыбокую пазнавальную ролю навукі і мастацтва, Бялінскі выступіў гарачым прыхільнікам асветы і адукацыі і мэту свайго жыцця бачыў у тым, каб навуку і мастацтва паставіць на службу народу.

В. І. Сцяпанаў грунтоўна аналізуе матэрыялістычныя погляды Бялінскага ў яго эстэтыцы: філасофскае абгрунтаванне рэалізма, ролю мовы і яе непарыўнасць з мысленнем, паняцце аб'ектыўнага і суб'ектыўнага ў мастацтве.

В. І. Сцяпанаў у сваёй кнізе аргументуе ленінскае палажэнне аб тым, што Бялінскі разам з іншымі рускімі рэвалюцыйнымі дэмакратамі ўшчыльную падыйшоў да дыялектычнага матэрыялізма і спыніўся перад гістарычным матэрыялізмам.

У 4-ым раздзеле Бялінскі характарызуецца як геніяльны сацыёлаг. І гэта зусім правамерна. Толькі ў сілу сацыяльна-эканамічнай адсталасці Расіі Бялінскі не змог падняцца да разумення гісторыі і ў поглядах на грамадства ў асноўным не выйшаў за рамкі ідэалізма і утапічнага сацыялізма. Нягледзячы на гэта, асобныя пытанні гісторыі, грамадскага прагрэсу, праблема заканамернасці, роля народа і асобы ў гісторыі і цэлы шэраг іншых пытанняў вырашаліся Бялінскім настолькі змястоўна і глыбока, што ён як сацыёлаг стаяў на цэлую галаву вышэй процьмы буржуазных гісторыкаў і сацыёлагаў таго часу. Гарачы патрыёт сваёй Радзімы, аднолькава далёкі нацыяналізму і касмапалітызму, Бялінскі ў сацыялогіі шукаў тэарэтычнае абгрунтаванне рэвалюцыйнага пераўтварэння Расіі. У гэтым складаліся яго моцныя бакі, за гэта яго ідэі з захапленнем успрымаліся лепшымі людзьмі Расіі.

Апошні раздзел прысвечаны барацьбе вакол ідэйнай спадчыны Бялінскага. Як вядома, вакол пытаняў гісторыі рускай філасофіі, у тым ліку вакол светапогляду Бялінскага, на працягу многіх дзесяцігоддзяў ідзе вострая ідэалагічная барацьба. Несумненнай заслугай В. І. Сцяпанава з'яўляецца тое, што ён з усёй паўнатой прасачыў дух партыйнасці ў гэтай барацьбе як з боку матэрыялістычнага кірунку, так і з боку ідэалістычнага, як з боку даследчыкаў-марксістаў, так і з боку рэакцыйных буржуазных аўтараў.

У гэтай вялікай і складанай рабоце ёсць некаторыя недахопы. Але яны нешматлікія і не зніжаюць агульнай каштоўнасці кнігі. У манаграфіі упамінаюцца работы і артыкулы савецкіх даследчыкаў аб Бялінскім, але нажаль, аўтар не дае ім належнай ацэнкі. У некаторых выпадках В. І. Сцяпанаў выступае супроць няправільных тлумачэнняў філасофскіх поглядаў Бялінскага, але не называе аўтараў і іх прац.

Звяртае на сябе ўвагу своеасаблівы стыль аўтара, яго ўменне выказаць у простых, часам скупых словах глыбокія думкі і палажэнні.

У 1961 годзе народы Савецкага Саюза і міравая прагрэсіўная грамадскасць будуць адзначаць 150-годдзе з дня нараджэння В. Г. Бялінскага. Вялікае манаграфічнае даследаванне В. І. Сцяпанава добры падарунак знамянальнаму юбілею.

**А. ПАЎЛЮЧЭНКА,**

# СТУДЭНТЫ УНІВЕРСІТЭТА ВЫКАНАЛІ АЛІМПІЙСКІЯ НАРМАТЫВЫ

Адбылося першынство па лёгкай атлетыцы сярод вышэйшых навучальных устаноў горада Мінска. У ім удзельнічалі спартсмены 10 ВНУ горада. Першае месца заваявалі лёгкаатлеты-студэнты інстытута фізкультуры—56.200 ачкоў, другое—каманда універсітэта—46.943 ачкі і трэцяе—спартсмены палітэхнічнага інстытута—42.249.

На дыстанцыі 100 метраў сярод мужчын атрымаў перамогу студэнт I курса гістфака Сяргей Сонцаў. Яго час—11 секунд. На дыстанцыі 200 метраў Сонцаў паказаў выдатны час—21,7 секунды. Гэты вынік дае права на ўключэнне ў кандыдаты ў алімпійскую каманду СССР.

Студэнтка II курса філалагічнага факультэта Марыя Верамейчык на другой фінальнай спробе кінула кап'ё на 47 метраў 76 сантыметраў. Гэта таксама з'яўляецца алімпійскім нарматывам.



У адным з маляўнічых куткоў Урала. Фотаэцюд А. ЛУКАШОВА.

# Казыча ДАНІЛА ШЫЛА

## РЭПАРТАЖ

**СЁННЯ МНЕ захацелася пабываць у пакоі пяцікурснікаў. Цікава, чым жа займаюцца вечарамі гэтыя ўжо амаль гатовыя настаўнікі. Нешта мяне пацягнула ў 74 пакой корпуса «А». За сталом ужо сядзелі ў поўнай спартыўнай гатоўнасці выпускнікі беларускага аддзялення два Уладзіміра—Канапліцкі і Віна град. На стале ляжаў, з нецярпеннем чакаючы сваёй работы, спартыўны інвентар—карты ігральныя і грошы звычайныя. Хлопцы чакалі сваіх сяброў.**

**—Нарэшце,—выдыхнуў Канапліцкі, калі ў пакой уваліліся плячысты Рыгор Цітавец і крыху вышэйшы за яго (мусіць, і карцёжнік лепшы) Алік Падлужны.**

**Цяпер у вайну ўступілі валеты і каралі, дамы і тузы. Яны то адымалі ў ігракоў грошы, то раптам давалі магчымасць выйграць ладную капейку. Толькі нешта Уладзіміру Канапліцкаму не вязло. Ён вельмі хваравіта ўспрыймаў выйгрышы сяброў і ставіў на кон усё новыя і новыя грошы. Толькі і барадатыя каралі, і выгаленыя вальты, і нават томна ўсміхаючыяся дамы нібы здзекаваліся над ім, дзябёлым і маладым, і прагульвалі грошы.**

**О, сёння гульня, здаецца, будзе вельмі цікавай. Сюды прыйшоў сам намеснік старшыні прафкома універсітэта па выхаваўчай рабоце студэнт 3 курса філфана Міхаіл Папоў. Сапраўды, ёсць дзе праводзіць выхаваўчую работу, ёсць каго выхоўваць. Але... што гэта такое?.. Паглядзіце! Паглядзіце!.. Папоў сам садзіцца за стол на месца раззлаванага няўдачай Канапліцкага і вынімае таксама грошы. О, цяпер гульня зацягнецца да раніцы, калі прыйшоў сюды сам Папоў. Хлопцы ведаюць, што часты госць 74 пакою (ён жа член прафкома) не любіць хутка канчаць гульню.**

**А таму мы больш не будзем працягваць нашага рэпартажа. Няхай яго працягваюць камсамольскія бюро рускага і беларускага аддзяленняў.**

**Даніла ШЫЛА.**

# ВЭСЭ

## (Вясенне-экзаменацыйная сатырычная энцыклапедыя)

### ВЫПУСК І пад рэд. ГЕНДЭЛЯ

**Канспект**—тое, аб чым марадь, але амаль ніхто не мае.

**Шпаргалка**—тая саломінка, за якую хапаецца тонучы. Часам бывае выратавальным кругам.

**Кансультацыя**—робіцца для таго, каб ты лішні раз пераканаўся, што нічога не ведаеш.

**Вясна**—выдумка д'ябла.

**Загар**—наогул карысны. Пры падрыхтоўцы да экзаменаў супроцьпаказаны.

**Кішэня**—сховішча ведаў.

**Букет**—выкарыстоўваецца для адурманьвання выкладчыка.

**Суткі**—час, якога якраз не хапае для канчатковай падрыхтоўкі.

**Раніца**—лепшая пара для... сна. Некаторыя наіўна думаюць, што гэта лепшы час для вучобы.

**Экзамены**—латэрэя з бясплатнымі білетамі. У «Волгу» не сядзеш, а ў лужыну магчыма.

**Плавец**—спачатку «плавае», потым «топіцца». Не дапамагаюць драўляныя прадметы (дошка, стол, стуллі і інш.), якія маюцца побач ў дастатковай колькасці.

**Адказ**—іспаведзь у грахах.

**Заліковая кніжка**—пасля запаўнення становіцца індульгенцыяй.

**Маўчанне**—на экзамене чамусьці не расцэньваецца як золата.

**Пяцёрка**—па словах усіх экзаменатараў, іх любімая адзнака. Чаму ж яны яе так рэдка ставяць?!

**Кінотэатр**—храм культуры, які так часта наведваюць студэнтыжрацы навукі ў час вучэбных заняткаў.

**Люстэрка**—на думку некаторых дзяўчат—неабходны прадмет пры падрыхтоўцы да экзаменаў.

# АНЁЛАК ЗАМОЧВАЕ ПАМІЛАВАННЕ

ЗДАРЭННІ

Добры чалавек жыве на хімічным факультэце. Вы яго пэўна ж ведаеце, Кісляковым ад роду быў і будзе ім.

Ціхі такі, незаўважны. Ну, бывае, перап'е калі-небудзь гэтай крыху разбаўленнай вадкасці $C_2H_5OH$ (спірт так на хімічным факультэце завецца). Але ж з кім не здараецца такое? Усе студэнты ды і сам сакратар камсамольскага бюро факультэта Браніцкі думаюць, анёлак і п'яны анёлкам застанецца. Мабыць таму, разглядаючы асабовую справу Кіслякова, які часценька прыгубляе $C_2H_5OH$, усе рашылі даць яму вымову.

—Браткі, родненькія, аддзячу, век за вас бога маліць буду. Вы ж мяне, браточкі і сястрычкі, выратавалі. Можа б з повады пайшлі адкаркавалі бутэлечкі са дзве.

Ніхто не ведае, хадзіў з ім хтонебудзь ці не замочваць паміласванне, але падвечар Кіслякову ўжо перастаўлялі ногі невядомыя. людзі. Паставяць яго, беднага, на ўласныя ножкі, а яны не трымаюць, падкошваюцца. І падае тады небарака. Стануць паднімаць—як зараве благім матам, лаецца, нібы шавец. І ў інтэрнаце лаяўся, і жонку збіваў. Шкада, што не папаўся яму Браніцкі. Хай бы ён адчуў кулак анёлка.

# ПЕТУШЫНАЯ ВАЯЎНІЧАСЦЬ

Стаяў чалавек ля дзвярэй адзін. Нешта толькі шураваў кулак аб кулак (мусіць, свярбелі) і скрыгаў зубамі. Пасля гэтага выйшаў другі. Першы доўга не думаючы:

— Бац, бац,—два разы па вуху.

Затым яму здалося, што гэтага мала.

— Бац, бац, бац,—пачулася яшчэ, толькі на гэты раз ужо тройчы.

Потым і пачалося. «Бацы» паўтараліся з такой маланкавай хуткасцю, што ніхто нават і зразумець не мог, каму яны належалі. Наступалі хвіліны зацішша, але тады чулася страшэнная лаянка.

Адзін з гэтых ваяўнічых петухоў быў Зінчанка—студэнт 3 курса юрфака, другі—супрацоўнік АН БССР Прыстаўкін. Хто з іх першым палез у бойку, Даніла Шыла не ведае. Але ён спадзяецца, што гэта не тайна для камсамольскага бюро юрфака.

# Выпадак у аўтаінспекцыі

Гэтае апошняе пачутае мной здарэнне адбылося ў аўтаінспекцыі.

Студэнт Садоўскі здаваў экзамен, правільней—хацеў здаць, па ваджэнню аўтамашыны. Ён з выглядам знаўцы сеў за руль. Але за што ён ні браўся, што ні круціў, што ні мацаў—машына нават і не фыркнула. Стаяла, нібыта ўкопаная. Тады ён прызнаўся, што бачыў раней толькі адзін руль машыны і расказаў такі ўрывак з лекцыі выкладчыка курсаў т. Копіна.

—Вось руль, — тлумачыць той,—бачыце ўсе?

—Бачым,—адказвае аўдыторыя.

—Ну і добра. Гэтага хопіць, а другі раз руль убачыце ў аўтаінспекцыі.

Мне здаецца, усё-такі нехітрая гэтая копінава навука.

☆ ☆ ☆

# А Б'Я В Ы

## НАСТОЙЛІВА

просім чытачоў зразумець, што запіска з разлікам п'янкі, што прыводзілася ў папярэднім выступленні Данілы Шылы, знойдзена не ў нашым пакоі.

Калі спатрэбіцца,

мы нават можам прывесці ў рэдакцыю сведак, якія падцвердзяць, што мы п'ем толькі адзін самагон-першак, дастаўлены з вёскі, а таму разлікаў такіх не магло быць. Па нашых меркаваннях яе маглі знайсці ў 28 пакоі корпуса «А» ці «Б».

Жыхары пакоя № 28 інтэрната па вуліцы Свярдлова.

*Мы, ранейшыя бландзінкі, папярэджваем усіх нашых знаёмых не палохацца, калі ўбачаць нашы рыжыя валасы і не наракаць на пякучае сонца. Сонца тут ні прычым. Яны сталі рыжымі ад асобнага хімічнага раствору, які размешваецца па патрабаваннях моды.*

*Галя Андрэйчык, 2 курс гістфака,*
*Іра Дзянісава, 4 курс гістфака.*

## КАСА ЎЗАЕМАДАПАМОГІ

слёзна просіць студэнтаў пазычыць ёй хоць тры рублі, якія патрэбны для пакупкі пер'я (канцылярскага) і сцірак (гумавых). Са стыпендыі

## АБАВЯЗУЕЦЦА

аддаць з працэнтамі. А аб'ява зроблена для таго, каб паведаміць усім, што каса нікому не дае грошай у доўг, а толькі бярэ.

Старшыня касы ўзаемадапамогі Пятро Валкавец.

## ПАПЯРЭДЖВАЕМ

усіх жыхароў пакояў, якія знаходзяцца пад намі, каб шчыльней зачынялі вечарамі вокны, бо мы ў хвіліны добрага настроя любім ліць з вакна розныя памыі.

Ул. Ганчароў, сакратар камсамольскага бюро аддз. беларускай мовы і літаратуры.
С. Капціловіч, Н. Чыгрын і іншыя жыхары 75 пакоя корпуса «А».

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Нам. рэдактара Р. ПЛАТОНАЎ.

АТ 03190 Зак. 881 Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.